# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**9 клас**

**Варыянт 2**

**Заданне 1.**

| Слова | Правільны варыянт напісання |
|---|---|
| р(а,о)знатыповыя экспанаты | р**о**знатыповыя |
| ік(а,о)награфічны | ік**о**награфічны |
| тур(і,ы)нвентар | тур**і**нвентар |
| экскурсан(тс,ц)кі | экскурсан**ц**кі |
| рэгі(а,я)нальны музей | рэгі**я**нальны |
| гіст(а,о)рыяграфія | гіст**а**рыяграфія |

*За кожнае правільнае слова – 1 бал.*

**Заданне 2.**

| Слова | Значэнні | № значэння |
|---|---|---|
| **дыван** | 1) прадмет мяккай мэблі для сядзення і ляжання, са спінкай і падлакотнікамі;<br>2) тканы, звычайна варсісты ўзорчаты выраб для ўпрыгожвання сцен, высцілання падлогі | **2** |
| **склон** | 1) нахіленая паверхня чаго-н.; пакаты спуск<br>2) форма іменнай часціны мовы | **2** |
| **плётка** | 1) кароткі раменны плецены бізун, пуга;<br>2) неправераная або лжывая чутка | **2** |
| **плот** | 1) агароджа вакол чаго-н.;<br>2) бярвенне, звязанае ў адзін або некалькі радоў для сплаву па вадзе | **1** |
| **пранік** | 1) салодкае печыва з духмянымі прыправамі;<br>2) плоскі драўляны брусок з ручкай для выбівання бялізны ці абмалоту лёну | **2** |
| **нядзеля** | 1) адзінка вылічэння часу ад панядзелка да наступнай нядзелі ўключна;<br>2) сёмы дзень тыдня | **2** |

*За кожнае правільна абранае лексічнае значэнне – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| Фразеалагізм | Значэнне | Кампанент | + |
|---|---|---|---|
| *не паказваць ...* | ‘не прыходзіць куды-н., не паяўляцца дзе-н.’ | *твару* | |
| | | *фізіяноміі* | |
| | | *носа* | + |
| | | *зубоў* | |
| | | *аблічча* | |
| *забыць ...* | ‘перастаць бываць дзе-н., наведваць каго-н.’ | *дарогу* | + |
| | | *шлях* | |
| | | *сцежку* | |
| | | *адрас* | |
| | | *дзверы* | |
| *залазіць у ...* | ‘незаконна карыстацца чужым дабром, абкрадваць каго-н.’ | *кішэнь* | + |
| | | *кашалёк* | |
| | | *партманет* | |
| | | *куфар* | |
| | | *сейф* | |
| *... з’еў* | ‘набыў вялікі вопыт, навык у якой-н. справе’ | *карову* | |
| | | *сабаку* | + |
| | | *ката* | |
| | | *кіта* | |
| | | *слана* | |
| *адным (адной) ... звязаны* | ‘аб’яднаны чым-н. агульным, непарыўным’ | *ланцугом* | |
| | | *шнурком* | |
| | | *шворкай* | |
| | | *нітачкай* | |
| | | *вяроўкай* | + |
| *казка пра белага ...* | ‘бясконцае паўтарэнне аднаго і таго з самага пачатку; вяртанне да таго самага’ | *ваўчка* | |
| | | *шашка* | |
| | | *катка* | |
| | | *бычка* | + |
| | | *галубка* | |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| | |
|---|---|
| трашчаць | **траскучы** |
| адкідаць | **адкідны** |
| абагачаць | **абагачальны** |
| зыходзіць | **зыходны** |
| спаць | **спальны** |
| муляць | **мулкі** |

*За кожны прыметнік – 1 бал; за кожны лішні прыметнік – мінус 1 бал.*

**Заданне 5.**

| | | |
|---|---|---|
| I. Выпішыце слова, якое мае наступную будову: прыстаўка, корань, суфікс, канчатак, постфікс<br><br>**З'яўляецца** | II. Зборны лічэбнік запішыце словам у творным склоне<br><br>**Чацвярымі** | III. Выпішыце пераходны дзеяслоў II спражэння закончанага трывання<br><br>**Увекавечыў** |
| IV. Выпішыце ў пачатковай форме слова, утворанае складана-нульсуфіксальным (складана-бяссуфіксным) спосабам<br><br>**Трыццацігоддзе** | V. Выпішыце займеннік, які не мае формы назоўнага склону, у прапанаванай кантэкстам форме і вызначыце яго склон.<br><br>**(На) сябе – вінавальны склон** | VI. Выпішыце ў прапанаванай кантэкстам форме лічэбнік, які ўжываецца ў значэнні займенніка.<br><br>**Адным** |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 1 бал.*

**Заданне 6.**

***Адказ:*** А1Б5В3Г2Д–Е6

*За кожную правільна запісаную пазіцыю (пару) – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Адзін з музеяў Полацка расказвае пра *(аб)* асаблівасці ручнога ткацтва на Паазер'і. На Беларусі ткацтва вядомае з глыбокай старажытнасці, аб чым *(пра што)* сведчаць археалагічныя знаходкі (прасніцы, адбіткі тканіны на керамічных пасудзінах, архаічныя прылады працы). Гэта самы распаўсюджаны і старажытны *(старадаўні)* від народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, непасрэдна звязаны з вырабам адзення і прадметаў побыту *(быту)*: пакрывал*(аў)*, абрусаў, ручнікоў і інш.

*За кожную памылку перакладу (лексічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,5 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,25 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| | |
|---|---|
| Эпітэт у вершы, напісаным 3-стопным амфібрахіем | **4** |
| Эпітэт і лексічная эпіфара | **1** |
| Эпітэт і рытарычнае пытанне | **8** |
| Эпітэт у празаічным творы | **3** |
| Эпітэт і зваротак | **2** |
| Эпітэты, што ўтвараюць антытэзу | **6** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 9.**

У пачатку 1884 года Францішак Багушэвіч вярнуўся ў Вільню, дзе заняўся ~~медыцынскай~~ **(адвакацкай / юрыдычнай)** дзейнасцю і напружанай літаратурнай творчасцю.

Тое, што доўгі час па-беларуску пісалася таемна, склала першую кнігу паэта – **“Дудка беларуская”,** якую ён пад псеўданімам ~~Гаўрыла з Полацка~~ **(Мацей Бурачок)** выдаў у Кракаве (Аўстра-Венгрыя) у 1891 годзе. А ў 1894 годзе выйшаў другі зборнік паэта – **“Смык беларускі”**.

Тэматыка, праблематыка і пафас яго творчасці дастаткова разнастайныя. Так, верш “Хмаркі” ўяўляе сабой узор ~~інтымнай~~ **(філасофскай / грамадзянскай / пейзажнай)** лірыкі. Своеасаблівае творчае крэда Францішка Багушэвіча сфармулявана ў вершы “Мая дудка”, дзе дудка ўвасабляе сабой паэзію, якая павінна служыць ~~тым, хто мае ўладу~~ **(народу / простым людзям / працоўным людзям)**.

Ранняя смерць паэта ў 1900 годзе не дала здзейсніцца яго планам – выдаць чарговы зборнік твораў. Значэнне творчасці Францішка Багушэвіча заключаецца не ў колькасці ім напісанага, а ў велічнасці яго таленту!

*За кожнае правільна запоўнены пропуск – 1 бал. За кожнае правільнае вызначэнне памылкі – 0,5 бала, за кожнае правільнае выпраўленне памылкі – 0,5 бала. За выпраўленне праўдзівай інфармацыі адымаецца 0,5 бала, але ў выніку не павінна быць менш за 0 балаў.*

**Заданне 10.**

| *Крытэрый* | *Колькасць балаў* |
|---|---|
| *Крэатыўнасць* | |
| *Прапанавана цікавая і арыгінальная ідэя паста, выкарыстоўваюцца нестандартныя ідэі, яркія вобразы* | *2* |
| *Пост не вызначаецца арыгінальнасцю* | *0* |
| *Інфарматыўнасць* | |
| *Прапанаваны перавагі і магчымасці віртуальнага музея (напрыклад, даступнасць, інтэрактыўнасць, унікальныя экспанаты, мультымедыйныя экспанаты), згадваюцца хаця б 2 беларускія пісьменнікі (асветнікі) даўняй літаратуры і 3 – XX ст.* | *3* |
| *Прапанаваны перавагі і магчымасці віртуальнага музея (напрыклад, даступнасць, інтэрактыўнасць, унікальныя экспанаты, мультымедыйныя экспанаты), згадваецца меншая колькасць пісьменнікаў даўняй літаратуры і XX стст.*<br>*АБО*<br>*Згадваюцца хаця б 2 беларускія пісьменнікі (асветнікі) даўняй літаратуры і 3 – XX ст., але не згадваюцца перавагі і магчымасці віртуальнага музея* | *2* |

| | |
|---|---|
| *Прапанаваны перавагі і магчымасці віртуальнага музея (напрыклад, даступнасць, інтэрактыўнасць, унікальныя экспанаты, мультымедыйныя экспанаты), згадваюцца пісьменнікі толькі даўняй літаратуры або толькі XX ст.*<br>*АБО*<br>*Згадваецца меншая колькасць пісьменнікаў даўняй літаратуры і XX ст., не згадваюцца перавагі і магчымасці віртуальнага музея* | *1* |
| *Прапанаваны перавагі і магчымасці віртуальнага музея (напрыклад, даступнасць, інтэрактыўнасць, унікальныя экспанаты, мультымедыйныя экспанаты), але не згадваюцца пісьменнікі*<br>*АБО*<br>*Згадваюцца пісьменнікі толькі даўняй літаратуры або толькі XX ст., але не згадваюцца перавагі і магчымасці віртуальнага музея* | *0,5* |
| *Не згадваюцца перавагі і магчымасці віртуальнага музея і не згадваюцца пісьменнікі* | *0* |
| *Заклік наведаць* | |
| *Прапанаваны сфармуляваны заклік наведаць музей менавіта для аднагодкаў* | *0,5* |
| *Няма закліку наведаць музей або заклік не арыентаваны на аднагодкаў* | *0* |
| *Колькасць слоў* | |
| *Колькасць слоў не перавышае 100* | *0,5* |
| *Колькасць слоў перавышае 100* | *0* |